из устоев религиозного мировоззрения – антропоцентризму. Учёный дал толчок к развитию новых открытий и пониманию современным человеком мироздания.

### Список источников и литературы

1. Боев, К. Л. Коперник / К. Л. Боев. – М. : Жургазобъединение, 1935. – 214 с.

2. Коперник, Н. О вращении небесных сфер / Н. Коперник – М. : Наука, 1964. – 653 с.

3. Гурев, Г. А. Системы мира: (от древних до Ньютона) / Г. А. Гурев. – М. : Издательство Академии наук СССР, 1940. – 196 с.

4. Гурев, Г. А. Коперниковская ересь в прошлом и настоящем: из истории взаимоотношений науки и религии / Г. А. Гурев. – М. : Государственное антирелигиозное издательство, 1933. – 138 с.

5. Клайн, М. Математика. Поиск истины / М. Клайн – М. : Мир, 1988. – 295 с.

УДК 271.4.9.523(477.43+477.44)

**Ю. Ю. Караблёў, С. А. Чаропка**
ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель

## МЕСЦА І РОЛЯ ЗАМОЙСКАГА САБОРА Ў ФАРМІРАВАННІ РУСКАЙ УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ

*У прадстаўленым артыкуле разглядаецца роля і месца Замойскага сабора Рускай уніяцкай царквы ў канфесійнай гісторыі беларускіх зямель Рэчы Паспалітай. У якасці асноўнага тэзіса артыкула выступае меркаванне аб тым, што менавіта Замойскі сабор, праведзены ў мэтах ўрэгулявання адносін паміж каталіцкай і уніяцкай цэрквамі, стаў рубежным пунктам у фарміраванні грэка-каталіцызму, пазначыўшы адыход абрадавай практыкі ўніяцкай царквы ад канвы традыцыйнага праваслаўя.*

Ролю хрысціянства ў гісторыі практычна любога з народаў Еўропы нельга пераацаніць. Хрысціянскі светапогляд праз прызму ідэалогіі асобных цэркваў – перадусім Каталіцкай і Праваслаўнай істотна паўплываў на ўсе сферы жыцця граммадства і да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сённяшняга названыя цэрквы працягваюць займаць важнае месца ў духоўным жыцці беларускага народа.

Адной з найбольш істотных праблем у жыцці беларускага грамадства Вялікага княства Літоўскага з’яўлялася рэлігійнае пытанне, цесна звязанае з крызісным становішчам праваслаўнай царквы Кіеўскай мітраполіі. У гістарыяграфіі склалася устойлівае перакананне аб тым, што пасля Берасцейскай царкоўнай уніі ў Рэчы Паспалітай узнікла Ўніяцкая царква, а Праваслаўная царква аказалася ў прыгнечаным становішчы. Аднак гэты тэзіс не толькі спрашчае разуменне канфесійных працэсаў у Рэчы Паспалітай, але і прыводзіць да не зусім іх карэктнага асэнсавання рэалій XVII ст. З заключэннем Берасцейскай уніі адразу ж не ўзнікла новай царкоўнай арганізацыі, адбыўся пераход раней існаваўшай структуры Грэка-Рускай Усходняй царквы Кіеўскай мітраполіі з пад ўлады Канстанцінопальскага патрыярха пад ўладу Рымскіх пап, а праваслаўнае насельніцтва ВКЛ падзялілася на два лагеры – тых, хто падтрымаў царкоўную ўнію – уніятаў, а таксама тых, хто яе рашуча адвергнуў – дызунітаў.

Працэс фарміравання самастойнай уніяцкай царквы ў Рэчы Паспалітай расцягнуўся на многія дзесяцігоддзі. Рашэнні Берасцейскага царкоўнага сабора і дзейнасць сабораў прыхільнікаў уніі ў XVII ст. сфармавалі асновы Рускай уніяцкай царквы канфесіі: іерархію, веравучэнне, богаслужбовыя практыкі. Калі гэты працэс у асноўным завяршыўся, новыя рэаліі, у якіх унія была ўжо завершанай з’явай, патрабавалі ад царкоўных лідэраў вызначыцца з далейшым кірункам развіцця. Тут было адкрыта два асноўных шляхі: далейшае збліжэнне з каталіцтвам і адстойванне самабытнасці Рускай уніяцкай царквы. Сацыяльна-палітычныя ўмовы ў Рэчы Паспалітай часта падштурхоўвалі уніяцкую знаць да пераходу ў каталіцтва, немалыя выгады гэта прыносіла і буйному духавенству, просты люд жа паступова стаў галоўным носьбітам уніяцтва, захаваўшы практычна ўсе рысы, якія былі ўласцівы ранейшаму праваслаўю [1, с.32-33].

Становішча уніяцкай царквы ў Рэчы Паспалітай вызначалася, сярод іншага, палітычнай кан'юнктурай. Каралеўскія ўлады ў розныя перыяды праводзілі то палітыку міжканфесійнага лавіравання, то адназначна станавіліся на бок каталіцкай царквы і праяўлялі сваю добразычлівасць толькі ў справах карысных для яе, часта менавіта ў гэтыя перыяды унія атрымлівала значную падтрымку. Такое становішча спраў было выклікана як складанай карцінай у міжнародных адносінах для Рэчы Паспалітай, так і слабой каралеўскай уладай, што было багата залежнасцю ад унутрыдзяржаўных арыстакратычных партый, якія

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКОРИНЫ

рэгулярна ўмешваліся ў дзяржаўную палітыку. Гэтымі ж абставінамі кіраваліся і ў адносінах да уніяцкай царквы [2, с.217-221].

У сферы рэлігійнай палітыкі ляжаў адзін з ключоў да ўрэгулявання ўнутраных спраў у Рэчы Паспалітай. У якасці асноўных праблем выступалі - канфлікты паміж праваслаўнымі і уніятамі і ціск з боку ўладаў, а таксама каталіцкай грамадскасці ў дачыненні да праваслаўных і пратэстантаў [3, с.659]. Рэлігійныя звады ўнутры слабеючага дзяржавы вялі да прэтэнзій і ўмяшанню суседзяў, галоўным чынам Швецыі і Расіі. У такіх умовах улады шукаюць разнастайныя шляхі ўнутранай кансалідацыі грамадства. У 70-я гады ўладамі падтрымліваецца план Жахоўская паводле якога ва ўніяцтва павінны былі перайсці пакінутыя праваслаўныя (дизунитские) епархіі на Украіне і ў Беларусі. Ініцыяванае ў гэтых умовах нараду ў Любліне затым перанесенае ў Варшаву, у якім удзельнічалі уніяты, праваслаўныя і пратэстанты, прайшло ў цэлым бясплённа [2, с. 230-234].

З канца XVII ст., нягледзячы на тое, што раней уніяты былі названы на сойме «другім касцёлам», царква ў пэўным сэнсе дыскрымінавалася. З пункту гледжання заходнерускай гістарычнай школы і блізкіх да яе аўтараў, гэта тлумачылася тым што унія ўжо выканала сваю ролю інструмента ў справе прыняцця «рускімі» каталіцтва [1, с.33-35]. Аднак сітуацыя выглядала далёка не так адназначна, існаваў шэраг аб'ектыўных прычын, які стымуляваў далейшую інтэграцыю цэркваў.

Зближэнне ўніятаў з каталікамі не было штучным працэсам і хутка набірала абароты, нягледзячы на тое, што частка прадстаўнікоў уніяцкага духавенства выказвала незадаволенасць гэтым. Акрамя таго, у Рэчы Паспалітай усё больш прадстаўнікоў шляхты, якая належала да ўніяцкай ці праваслаўнай цэркваў, пераходзіла ў каталіцтва ў сувязі з мэтаю атрымаць больш высокае сацыяльнае становішча. У сувязі з гэтым уніяцтва, трывала замацаваўшыся на заходнеўкраінскіх і беларускіх землях, паступова становіцца рэлігіяй народных мас.

Так ці інакш да пачатку XVIII ст. стабілізавалася і акрэсліла сябе сфера ўплыву уніі, склалася літургічная традыцыя і абраднасць уніятаў. Вектар культурнага развіцця ўніяцкай царквы, які зарыентаваўся яшчэ ў XVII ст. на Захад, даў свой плён і, хоць уніяцкая царква імкнулася захаваць сваю самабытнасць і абараніць сябе ад поўнага акаталічвання, было зразумела, што інтэграцыя з каталікамі будзе працягвацца.

Комплекс назапашаных пытанняў падштурхнуў вышэйшае ўніяцкае духавенства да арганізацыі сабора. Значная роля ў яго

арганізацыі належыць мітрапаліту Льву Кішку. У лісце рымскаму пантыфіку, Кішка акрэсліў задачы сабора наступным чынам: «гэтая праца неабходная для ўвасаблення ў жыццё канонаў, паляпшэння маральнасці, ліквідацыі бязладзіцы ў абраднасці, паляпшэння цырымоній, дысцыпліны і сакрамэнтаў» [4, p.39]. Удзел дзяржавы ў гэтым праекце быў мінімальным, аднак, без сумневу, улады сачылі за тым, што адбываецца. У 1720 г., папскае breve было разаслана біскупам і ўтрымлівала дабраславенне сабора [84, с.100].

Прынятыя саборы ў Замосці пастановы закраналі дагматыку, абраднасць і арганізацыю і былі сфармуляваны ў дзевятнаццаці саборных раздзелах. Сярод галоўных пастаноў сабора можна адзначыць наступныя. Уводзіўся кантроль над правільным ужываннем filioque. Вялікая роля надавалася адукацыі. Прадпісвалася выкладанне слова Божага, за ігнараванне указанняў належыў штраф. Была створана дэпутацыя, якая павінна была арганізаваць навучанне катэхізісу і рэгулярна сачыць за яго тлумачэннем. У абавязкі біскупаў гэтак жа ўводзілася прапаведаваць катэхізіс. Прадпісавалася арганізацыя пры ўніяцкіх манастырах школ для здольных дзяцей, перш за ўсё дзяцей святарства.

Надавалася ўвага барацьбе з сіманіяй, забаранялася патрабаваць у насельніцтва грошы за трэбы, пры гэтым добраахвотныя ахвяраванні дазваляліся. Пры кожнай епіскапскай катэдры павінны былі служыць афіцыялы, якія мусілі сачыць за ажыццяўленнем саборных пастаноў.

Важным стаў трэці раздзел саборных пастаноў, дзе закраналіся пытанні сакрамэнту. Святары абавязваліся ажыццяўляць сакрамэнт па ўсталяванаму парадку, прадпісвалася выданне трэбнікаў для ўвядзення аднастайнасці рытуалаў. Асобна былі дадзены каментары да сакрамэнтаў, у іх лік увайшлі: хрышчэнне (de Babtismo), памазанне (de Confirmatione), прычашчэнне (de Eucharystia), пакаянне (de Poenitentia), намашчэнне хворых (de Exrema unctione), святарства (de sacris ordinationibus) , шлюб (de Matrimonio). Быў таксама прыняты шэраг пастаноў, якія датычыліся парадку вядзення літургіі [5].

Такім чынам, у абрадавай частцы была ўведзена аднастайнасць рытуалаў і сакрамэнтаў. У аддаленай перспектыве гэта спрыяла большай кансалідацыі ўніятаў і фармаванню самастойнай уніяцкай культуры на аснове элементаў праваслаўя і каталіцызму, заходняй і беларуска-ўкраінскай культур. У бліжэйшай перспектыве гэта дазваляла адасобіць уніяцкую абраднасць ад праваслаўнай, забяспечыць чысціню і правільнасць выканання сакрамэнтаў. Прыкметным стала ўкараненне большай колькасці рымскіх практык

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

у абраднасці і рымскай дагматыкі ва ўніяцкай царкве. Разам з тым, меў месца кампраміс, была ўпарадкавана лацінізацыя ўніяцкай царквы і акрэслены яе межы. Нязыблемай асновай абраднасці засталася візантыйская традыцыя, у тым ліку царкоўнаславянская мова. Замойскі сабор выразна падкрэсліў адасабленне ўніятаў ад праваслаўных і завяршыў фарміраванне не проста асобнай царквы, а канфесіі – грэка-каталіцтва, якое прыйшло на змену старой уніі. Улічваючы канчатковы разрыў і канфрантацыю паміж уніятамі і праваслаўнымі, збліжэнне з каталікамі было заканамерным вектарам развіцця ўніі.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Записки Иосифа митрополита Литовского. - СПб.: тип. имп. А. Н., 1883. - Т.1. – 745 с.
2. Коялович, М. О. Литовская церковная уния. В 2-х т., Т. 2 / М. О. Коялович. – СПб., 1859-1862. – 772 с.
3. Карташев, А. В. Очерки истории Русской церкви / А. В. Карташёв. – Париж: YMCA, 1959. — Т.1. – 685 с.
4. Likowski, E. Dzieje Kościoła unickiego na Litwie i Rusi w XVIII i XIX wieku uważane głównie ze względu na przyczyny jego upadku. Cz. 1. – Warszawa: ksegarnia Gebetnera I Wolffa, 1906. – 222 s.
5. Synod prowincialny ruski w mieście Zamościu roku 1720 odprawiony. – Wilno: drukarnia XX. Bazylianow, 1785. – 228 s.


УДК 271.4.9.523(477.43+477.44)«17»

**М. В. Василенко**
ГГУ имени Ф. Скорины, г. Гомель

# АРХИТЕКТУРА УНИАТСКИХ ЦЕРКВЕЙ ПОДОЛЬЯ В 18 ВЕКЕ

*Статья посвящена рассмотрению архитектуры униатских церквей, расположенных на территории Подолья и построенных в 18 в. Сделан вывод, что середина – вторая половина 18 в. стали временем массового церковного строительства на Подолье. Подавляющее большинство униатских церквей того времени были построены из дерева.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ